Учреждение образования «Барановичский государственный университет»

# Вестник БарГУ

**Научно-практический журнал**

Издаётся с марта 2013 года
Выходит 2 раза в год

№ 2 (10), август, 2021

Серия «Педагогические науки. Психологические науки. Филологические науки (литературоведение)»

*Учредитель*: учреждение образования «Барановичский государственный университет».

*Адрес редакции:*
ул. Войкова, 21, 225404 г. Барановичи.
Телефон: +375 (163) 64 34 77.
E-mail: vestnik@barsu.by .

*Подписные индексы:* 00993 — для индивидуальных подписчиков; 009932 — для организаций.
Свидетельство о регистрации средств массовой информации № 1533 от 30.07.2012, выданное Министерством информации Республики Беларусь.

*В соответствии с приказом Высшей аттестационной комиссии Республики Беларусь от 21 января 2015 г. № 16 научно-практический журнал «Вестник БарГУ» серия «Педагогические науки. Психологические науки. Филологические науки (литературоведение)» включён в Перечень научных изданий Республики Беларусь для опубликования результатов диссертационных исследований по педагогическим и психологическим наукам, филологическим наукам (литературоведению).*

*Научно-практический журнал «Вестник БарГУ» включен в РИНЦ (Российский индекс научного цитирования), лицензионный договор № 06-01/2016.*

Выходит на русском и английском языках.
Распространяется на территории Республики Беларусь.

*Исполняющий обязанности заведующего редакционно-издательской группой* Н. Н. Колодко
*Технический редактор* Л. Н. Щербук
*Компьютерная вёрстка* С. М. Глушак
*Корректор* Н. Н. Колодко

Подписано в печать 15.07.2021. Формат 60 × 84 1/8.
Бумага ксероксная. Печать цифровая.
Гарнитура Таймс. Усл. печ. л. 16,00. Уч.-изд. л. 11,40.
Тираж 100 экз. Заказ . Цена свободная.

Полиграфическое исполнение: Гродненское областное унитарное полиграфическое предприятие «Слонимская типография». Свидетельство о государственной регистрации издателя, изготовителя, распространителя печатных изданий № 1/203 от 07.03.2014, № 2 от 25.02.2014.
*Адрес: ул. Хлюпина, 16, 231800 г. Слоним, Гродненская обл.*

**РЕДАКЦИОННАЯ КОЛЛЕГИЯ**

Кочурко В. И. *(гл. ред. журн.)*, доктор сельскохозяйственных наук, профессор, академик Белорусской инженерной академии, академик Международной академии технического образования, академик Международной академии наук педагогического образования, академик Академии экономических наук Украины, ректор учреждения образования «Барановичский государственный университет» (Барановичи, Республика Беларусь).

Климук В. В. *(зам. гл. ред. журн.)*, кандидат экономических наук, доцент, проректор по научной работе учреждения образования «Барановичский государственный университет» (Барановичи, Республика Беларусь).

Яценко Т. Е. *(гл. ред. сер.)*, кандидат психологических наук, доцент (Барановичи, Республика Беларусь); Захарченя Н. Ф. *(отв. секретарь сер.)* (Барановичи, Республика Беларусь).

Маркевич В. И. *(ред. текстов на англ. яз.)* (Барановичи, Республика Беларусь); Шило Е. В. *(ред. текстов на англ. яз.)* (Барановичи, Республика Беларусь).

Пономарёва Е. И. *(отв. за направление «Педагогические науки»)*, кандидат педагогических наук, доцент (Барановичи, Республика Беларусь); Иценко А. Г. *(отв. за направление «Психологические науки»)*, кандидат философских наук, доцент (Барановичи, Республика Беларусь); Фенчук О. Н. *(отв. за направление «Филологические науки»)*, кандидат филологических наук (Барановичи, Республика Беларусь).

Белановская О. В., кандидат психологических наук, доцент (Минск, Республика Беларусь); Белая Е. И., доктор филологических наук, доцент (Барановичи, Республика Беларусь); Бельский А. И., доктор филологических наук, профессор (Минск, Республика Беларусь); Валитова И. Е., кандидат психологических наук, доцент (Брест, Республика Беларусь); Брусевич А. А., кандидат филологических наук, доцент (Гродно, Республика Беларусь); Глазырина Л. Д., доктор педагогических наук, профессор (Минск, Республика Беларусь); Джига Н. Д., доктор психологических наук, доцент (Барановичи, Республика Беларусь); Дубешко Н. Г., кандидат педагогических наук (Барановичи, Беларусь); Капранова В. А., доктор педагогических наук, профессор (Минск, Республика Беларусь); Клещёва Е. А., кандидат психологических наук, доцент (Барановичи, Республика Беларусь); Кормнова Н. А., кандидат философских наук, доцент (Барановичи, Республика Беларусь); Кремень М. А., доктор психологических наук, профессор (Минск, Республика Беларусь); Леонова Е. А., кандидат филологических наук, доцент (Минск, Республика Беларусь); Лопатик Т. А., доктор педагогических наук, профессор (Минск, Республика Беларусь); Макаревич А. Н., доктор филологических наук, доцент (Могилёв, Республика Беларусь); Олифирович Н. И., кандидат психологических наук, доцент (Минск, Беларусь); Пергаменщик Л. А., доктор психологических наук, профессор (Минск, Республика Беларусь); Пузыревич Н. Л., кандидат психологических наук, доцент (Минск, Республика Беларусь); Пучинская Т. М., кандидат педагогических наук, доцент (Барановичи, Республика Беларусь); Тарантей В. П., доктор педагогических наук, профессор (Гродно, Республика Беларусь); Торхова А. В., доктор педагогических наук, профессор (Минск, Республика Беларусь); Храмцова Ф. И., доктор политических наук, профессор, кандидат педагогических наук (Минск, Республика Беларусь); Шматкова И. В., кандидат психологических наук, доцент (Брест, Республика Беларусь)

**МЕЖДУНАРОДНЫЙ РЕДАКЦИОННЫЙ СОВЕТ СЕРИИ**

Мухтарова Ш. М., доктор педагогических наук (Караганда, Республика Казахстан); Николаева М. В., доктор педагогических наук, доцент, профессор (Волгоград, Российская Федерация); Селиванов В. В., доктор психологических наук, профессор (Москва, Российская Федерация).

© БарГУ, 2021

Репозиторий БарГУ

Baranovichy State University

# BarSU Herald

**A scientific and practical journal**

Published since March 2013 2 (10), August, 2021 Series "Education. Psychology. Philology (Literary studies)"
It is published 2 times a year

*Promoter:* Baranovichy State University.

*Editorial address:*
21 Voykova Str., 225404 Baranovichy.
Phone: +375 (163) 45 46 28.
E-mail: vestnik@barsu.by .

*Subscription indices:* 00993 — for individual subscribers; 009932 — for companies.
The certificate of the registration of mass media № 1533 of 30.07.2012 issued by the Ministry of Information of Belarus.

*In accordance with the order of the board of the Higher Attestation Commission of the Republic of Belarus, on January 21, 2015 № 16 the scientific and practical journal "BarSU Herald" the series "Education. Psychology. Philology (Literary studies)" was included in the list of the scientific publications of the Republic of Belarus for publishing the results of dissertation research on pedagogical, psychological and philological sciences (Literary studies).*

*Scientific-and-practical journal "BarSU Herald" is included into RSCI (Russian Science Citation Index), license agreement № 06-01/2016.*

Issued in Russian and English. The journal is distributed on the territory of the Republic of Belarus.

*Interim managing editor* N. N. Kolodko
*Technical editor* L. N. Scherbuk
*Desktop Publishing* S. M. Glushak
*Proofreader* N. N. Kolodko

Signed print 15.07.2021. Format 60 × 84 1/8. Paper xerox. Digital printing. Headset Times. Conv. pr. s. l. 16,00. Acc.-pub. s. l. 11,40. Circulation of 100 copies.
Order . Free price.

Printing performance: Grodno Regional Printing Unitary Enterprise "Slonim printing establishment". The state registration certificate of the publisher, manufacturer and publications distributor № 1/203 of 07.03.2014, № 2 of 25.02.2014. Address: 16 Hlyupin St., 231800 Slonim, Grodno region.

**EDITORIAL BOARD**

Kochurko V. I. *(chief editor)*, Doctor of agricultural Sciences, Professor, academician of the Belarusian Academy of engineering, academician of the International Academy of technical education, academician of the International Academy of pedagogical education, academician of the Academy of economic Sciences of Ukraine, rector of Baranovichy State University (Baranovichy, the Republic of Belarus).

Klimuk V. V. *(deputy chief editor)*, PhD in Economics, Associate Professor, Vice-Rector for Scientific Work of Baranovichy State University (Baranovichy, the Republic of Belarus).

Yatsenko T. E. *(chief editor of the series)*, PhD in Psychology, Associate Professor (Baranovichy, the Republic of Belarus); Zhakharchenya N. F. *(executive secretary of the series)* (Baranovichy, the Republic of Belarus).

Markevich V. I. *(text editor in English)* (Baranovichy, the Republic of Belarus); Shilo E. V. *(text editor in English)* (Baranovichy, the Republic of Belarus).

Ponomareva E. I. *(responsible for the direction "Pedagogical science")*, PhD in Education, Associate Professor (Baranovichy, the Republic of Belarus); Itsenko A. G. *(responsible for the direction of "Psychological Sciences")*, PhD in Philosophy, Associate Professor (Baranovichy, the Republic of Belarus); Fenchuk O. N. *(responsible for the direction of "Philological Sciences")*, PhD in Philology (Baranovichy, the Republic of Belarus).

Belanovskaya O. V., PhD in Psychology, Associate Professor (Minsk, the Republic of Belarus); Belaya E. I., Doctor of Philological Sciences, Associate Professor, (Baranovichy, the Republic of Belarus); Belsky A. I., Doctor of Philology, Professor, (Minsk, the Republic of Belarus); Valitova I. E., PhD in Psychology, Associate Professor (Brest, the Republic of Belarus); Brusevich A. A., PhD in Philology, Associate Professor (Grodno, the Republic of Belarus); Glazyrina L. D., Doctor of Pedagogical Sciences, Professor (Minsk, the Republic of Belarus); Dzyga N. D., Doctor of Psychological Sciences, Associate Professor (Baranovichy, the Republic of Belarus); Dubeshka N. G., PhD in Education (Baranovichy, the Republic of Belarus); Kapranova V. A., Doctor of Pedagogical Sciences, Professor (Minsk, the Republic of Belarus); Kleshcheva E. A., PhD in Psychology, Associate Professor (Baranovichy, the Republic of Belarus); Kormnova N. A., PhD in Philosophy, Associate Professor (Baranovichy, the Republic of Belarus); Kremen M. A., Doctor of Psychological Sciences, Professor (Minsk, the Republic of Belarus); Leonova E. A., PhD in Philology, Associate Professor (Minsk, the Republic of Belarus); Lopatik T. A., Doctor of Pedagogical Sciences, Professor (Minsk, the Republic of Belarus); Makarevich A. N., Doctor of Philological Sciences, Associate Professor (Mogilev, the Republic of Belarus); Olifirovich N. I., PhD in Psychology, Associate Professor (Minsk, the Republic of Belarus); Pergamenshchik L. A., Doctor of Psychological Sciences, Professor (Minsk, the Republic of Belarus); Puzyrevich N. L., PhD in Psychology (Minsk, the Republic of Belarus); Puchinskaya T. M., PhD in Education, Associate Professor (Baranovichy, the Republic of Belarus); Tarantei V. P., Doctor of Pedagogical Sciences, Professor (Grodno, the Republic of Belarus); Torchova A. V., Doctor or Pedagogical Sciences, Professor (Minsk, the Republic of Belarus); Khramtsova F. I., Doctor of Political Sciences, Professor (Minsk, the Republic of Belarus); Shmatkova I. V., PhD in Psychology, Associate Professor (Brest, the Republic of Belarus).

**INTERNATIONAL EDITORIAL BOARD SERIES**

Mukhtarova Sh. M., Doctor of Pedagogical Sciences (Karaganda, Republic of Kazakhstan); Nikolaeva M. V., Doctor of Pedagogical Sciences, Associate Professor, Professor (Volgograd, the Russian Federation); Selivanov V. V., Doctor of Psychological Sciences, Professor (Moscow, the Russian Federation).

© BarSU, 2021

Репозиторий БарГУ

## СОДЕРЖАНИЕ / CONTENTS

### ПЕДАГОГИЧЕСКИЕ НАУКИ / EDUCATION


| | | |
|---|---|---|
| **Василевич Н. А.** Методика формирования у младших школьников логических умений: содержательно-процессуальный аспект | **4** | **Vasilevich N. A.** Methodology of formation of logical skills in primary school children: substantive and procedural aspects |
| **Ермакович Л. И., Туровец В. С.** Социально-педагогический аспект в образовательной деятельности Ордена иезуитов | **11** | **Ermakovich L. I., Turovets V. S.** Socio-pedagogical aspect in the educational activities of the Jesuit Order |
| **Лемех Е. А.** Перспективные направления развития системы оценки качества дошкольного образования лиц с тяжелыми множественными нарушениями в центре коррекционно-развивающего обучения и реабилитации | **18** | **Lemekh E. A.** Promising directions of the quality assurance system development in preschool education for persons with severe multiple disorders in the correction- and development-training centre |
| **Миранкова Е. В.** Формирование эстетической культуры у младших школьников в процессе проектной деятельности | **23** | **Mirankova E. V.** Formation of aesthetic culture in primary school children in the process of project activities |
| **Никашина Г. А.** Структурно-функциональный анализ методической системы опережающего развития дошкольников | **30** | **Nikashina G. A.** Structural and functional analysis of the methodical system of outstripping development of preschoolers |
| **Романчук Н. В.** Структурно-содержательная модель развития коммуникативных компетенций у будущих педагогов по предупреждению конфликтов в образовательной среде | **37** | **Romanchuk N. V.** Structural-content model of the development of communicative competencies of future teachers on conflict prevention in the educational environment |
| **Филимонова Н. И.** Развитие координационных способностей у студентов в процессе физического воспитания | **44** | **Filimonova N. I.** Development of students' coordination abilities in the process of physical education |
| **Шкор Л. А.** Философско-антропологический и герменевтический контексты развития неинституциональных практик полихудожественного образования | **49** | **Shkor L. A.** Philosophical-anthropological and hermeneutic contexts of the development of non-institutional practices of poly-art education |


### ПСИХОЛОГИЧЕСКИЕ НАУКИ / PSYCHOLOGY


| | | |
|---|---|---|
| **Грицовец А. Н.** Особенности развития знаково-символической деятельности у детей дошкольного возраста | **54** | **Gricovec A. N.** The features of development of sign-symbolic activities of preschool children |
| **Джига Н. Д.** Созидание как процесс становления продуктивного субъекта образования средствами инновационных образовательных технологий | **59** | **Juha N. D.** Creation as a process of formation of a productive subject of education by means of innovative educational technologies |
| **Кузьмина Н. В., Нещерет Т. В.** А. Т. Ростунов и современная акмеология | **66** | **Kuzmina N. V., Nescheret T. V.** A. T. Rostunov and modern acmeology |
| **Лосик Г. В.** О запрете «убивать» человека и умении прощать его | **72** | **Losik G. V.** On the prohibition "to kill" a human and the ability to forgive him/her |
| **Марищук Л. В.** Направленность — стержень личности (памяти профессора, полковника Александра Тимофеевича Ростунова) | **79** | **Marischuk L. V.** Orientation is a person' pivot (in commemoration to professor, colonel Alexander Timofeevich Rostunov) |
| **Ракицкая А. В.** Связь сексизма и отношения к агрессии и насилию в добрачный период | **84** | **Rakitskaya A. B.** Relationship between sexism and attitudes towards aggression and violence in the premarital period |
| **Стреленко А. А.** Проблема социального восприятия и понимания приемного ребенка матерями в замещающих семьях | **89** | **Strelenko A. A.** The problem of social perception and understanding of a foster child by the mother in the foster families |
| **Яценко Т. Е.** Особенности эмоциональной привязанности к родителям у девушек, склонных к виктимному поведению | **96** | **Yatsenka T. E.** Peculiarities of emotional attachment to parents in girls liking victim behavior |


### ФИЛОЛОГИЧЕСКИЕ НАУКИ / PHILOLOGY
#### Литературоведение / Literary studies


| | | |
|---|---|---|
| **Благодёрова Е. И.** Мотив «дикая местность» в малой прозе Н. Готорна | **104** | **Blagodyorova E. I.** The "wilderness" motif in N. Hawthorne's tales |
| **Косціна Ж. В.** Патрыятызм у сістэме эстэтычных каштоўнасцей літаратуры Беларусі першай паловы XIX стагоддзя | **110** | **Kostina Zh. V.** Patriotism in the system of aesthetic values of Belarusian literature of 1st half of 19th century |
| **Криштоп И. С.** Проблема идентификации в романе Уильяма Гибсона «Распознавание образов» | **115** | **Kryshtop I. S.** The problem of identification in William Gibson's novel "Pattern recognition" |
| **Фенчук О. Н.** Акустические образы воспоминаний в лирике И. А. Бунина | **121** | **Fenchuk O. N.** Acoustic images of memories in the lyrics of I. A. Bunin |


Репозиторий БарГУ

УДК 882.6.09(091)(075.8)

**Ж. В. Косціна**
Установа адукацыі «Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт», вул. Войкава, 21, 225404 Баранавічы,
Рэспубліка Беларусь +375 (29) 725 54 36, 453463@tut.by

# ПАТРЫЯТЫЗМ У СІСТЭМЕ ЭСТЭТЫЧНЫХ КАШТОЎНАСЦЕЙ ЛІТАРАТУРЫ БЕЛАРУСІ ПЕРШАЙ ПАЛОВЫ XIX СТАГОДДЗЯ

У артыкуле разглядаецца паняцце «патрыятызм», тыпы патрыятызму, якія па-мастацку раскрыты ў літаратурных творах Беларусі першай паловы XIX стагоддзя. «Грамадзянскі» патрыятызм уласцівы паэзіі ўсіх рамантыкаў. Найбольш даследавана айчынным літаратуразнаўствам творчасць Адама Міцкевіча, Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча, Яна Баршчэўскага. Аўтар артыкула аналізуе мастацкія тэксты Ануфры Петрашкевіча, Тамаша Зана, Міхала Рукевіча, Аляксандра Ходзькі з мэтай выяўлення вобразна-семантычнага рада, праз які раскрываецца патрыятызм як эстэтычная каштоўнасць літаратуры Беларусі першай паловы XIX стагоддзя. Асноўнымі вобразамі-персанажамі становяцца паганскі жрэц, вайдэлот, майстар-штукар як захавальнікі «духу продкаў», сімваламі — стары разбураны замак як сведчанне мінулай славы Айчыны, чаша, або чара, як знак прычашчэння ідэяй патрыятычнага служэння.

**Ключавыя словы:** патрыятызм; «грамадзянскі» патрыятызм; літаратура Беларусі першай паловы XIX стагоддзя; рамантызм; паэты-філаматы; Ануфры Петрашкевіч; Тамаш Зан; Міхал Рукевіч; Аляксандр Ходзька.
Бібліягр.: 9 назваў.

**Zh. V. Kostina**
Baranovichi State University, 21 Voykova Str., 225404 Baranovichi, the Republic of Belarus,
+375 (29) 725 54 36, 453463@tut.by

# PATRIOTISM IN THE SYSTEM OF AESTHETIC VALUES OF BELARUSIAN LITERATURE OF 1st HALF OF 19th CENTURY

This article considers terms such as “patriotism”, types of patriotism, which artistically revealed in literature creations of 1st half of 19th century. The “public” patriotism patriotism inherent in the poetry of all romantic poets. Creation of Adam Mitskevich, Vincent Dunin-Martsinkevich, Yan Barszewski was more researched by native literature researchers. The author of this article is analyzing of literary texts of Anufryi Petrashkevich, Tamash Zan, Mikhal Rukevich, Alexandr Hodz’ko for identification of figurative-semantic row, which discovering patriotism as aesthetic value of Belarusian literature of 1st half of 19th century. The main characters are a pagan priest, vaydelot, a master magician as keepers of the “spirit of the ancestors”, symbols are an old ruined castle as evidence of the past glory of the Fatherland, a cup or cup as a sign of initiation into the idea of patriotic service.

**Key words:** patriotism; “public” patriotism; Belarusian literature of 1st half of 19th century; romanticism; philomatic poets; Anufryi Petrashkevich; Tamash Zan; Mikhal Rukevich; Alexandr Hodz’ko.
Ref.: 9 titles.

**Уводзіны.** Пачуццё патрыятызму становіцца асноўнай рысай характару многіх персанажаў, а таксама лірычнага героя мастацкіх твораў літаратуры Беларусі першай паловы XIX стагоддзя. Гэта абумоўлена эстэтычнай праблемай гістарызму, якая была пастаўлена і развіта ў літаратурнай барацьбе рамантыкаў і класіцыстаў. У мастацкіх творах гэта вылілася не толькі ва ўзнаўленні гэтак званага мясцовага каларыту (франц. *couleur locale*), але і ў адлюстраванні «духу часу» — духу розных эпох і нацыянальных культур, пад якімі рамантыкі разумелі асаблівасці нацыянальнага ўкладу, вераванняў, абрадаў, паняццяў і паводзін людзей. Літаратуру Беларусі першай паловы XIX — сярэдзіны XIX стагоддзя называюць перыядам нараджэння і пачаткам станаўлення новай беларускай літаратуры, а таксама рамантызму, бо «як-

© Косціна Ж. В., 2021

Рэпазіторый БарДУ

раз у межах першага паўстагоддзя з уздымам нацыянальнага руху пасля ліквідацыі Рэчы Паспалітай нарадзіўся і ва ўсёй велічы расквітнеў на Беларусі гэты новы літаратурны напрамак, які прыйшоў на змену класіцызму. Праўда, перыяд рамантызму на зусім укладаецца ў строгія паўвекавыя рамкі, пашырае іх. Апошнім "усплёскам" рамантызму лічыцца паўстанне 1863 года» [1, с. 10]. Станаўленне нацыянальнай і адпаведна мастацкай свядомасці было звязана з вызваленчай барацьбой жыхароў заходняй часткі Расійскай імперыі. Менавіта любоў да Айчыны, актыўная дзейнасць на яе карысць увасабляюцца ў пачуцці патрыятызму.

**Матэрыялы і метады даследавання.** Матэрыялам даследавання выступаюць мастацкія тэксты Ануфры Петрашкевіча, Тамаша Зана, Міхала Рукевіча, Аляксандра Ходзькі, у якіх раскрываецца патрыятызм як эстэтычная каштоўнасць літаратуры Беларусі першай паловы XIX стагоддзя. Метадалогія даследавання складалася з улікам прынцыпаў аксіялагічнага і кантэкстуальнага падыходаў. Асноўнымі метадамі даследавання паслужылі культурна-гістарычны, біяграфічны, метад ідэйна-кампазіцыйнага аналізу мастацкага твора.

**Вынікі даследавання і іх абмеркаванне.** Студэнты-філаматы, творчасць якіх стала сведчаннем з'яўлення на Беларусі новай мастацка-эстэтычнай сістэмы — рамантызму, лічылі служэнне Айчыне найвышэйшым патрыятычным абавязакам і духоўным падмуркам сваёй творчасці. Патрыятызм стаў той дамінуючай эстэтычнай каштоўнасцю, «з якой усходнеславянскі рамантызм пачынаў дыялог з усёй еўрапейскай супольнасцю па пытанні аб лёсе сваёй краіны, якая была яшчэ зусім нядаўна ўплывовай і моцнай дзяржавай» [2, с. 19].

М. М. Скібіцкі, аўтар артыкулаў «Філасофскага слоўніка», падае: «Патрыятызм — маральны і палітычны прынцып, сацыяльнае пачуццё, зместам якога з'яўляецца любоў да Айчыны, адданасць ёй, гордасць за яе мінулае і сучаснасць, імкненне абараняць інтарэсы радзімы. Патрыятызм — адно з глыбокіх пачуццяў, замацаваных стагоддзямі і тысячагоддзямі адасобленых айчынаў. Патрыятызм — адна з форм дыялектычнага спалучэння асабістых і грамадскіх інтарэсаў, адзінства чалавека і грамадства. Патрыятычныя пачуцці, ідэі ўзвышаюць асобу, калі яны злучаюцца з павагай да народаў іншых краін і не выраджаюцца ў псіхалогію нацыяналістычнай выключнасці» [3, с. 415]. Патрыятызм улічвае інтарэсы асобы і грамадства, але не змяшчае ў сабе служэнне інтарэсам улады, дзяржаўным інстытутам. Сучасны расійскі палітолаг Марыя Снегавая ў артыкуле «Сляпыя плямы любові да радзімы» услед за прадстаўнікамі сацыяльных навук падзяляе патрыятызм на «сляпы» і «грамадзянскі». «Сляпы» патрыятызм — адносіны да краіны з беспярэчна станоўчай ацэнкай сваёй радзімы і нецярпімасцю да крытыкі сваёй дзяржавы. Носьбіты такога тыпу вызначаюцца слабай палітычнай актыўнасцю, высокім узроўнем нацыяналізму, павышанай пачуццёвасцю да знешніх пагроз, шанаваннем дзяржаўных сімвалаў. Грамадзянскі, або «канструктыўны», патрыятызм — «гэта любоў асобы да сваёй краіны, звязаная з аналізам і крытыкай існуючай сітуацыі і імкненнем палепшыць стан грамадзян у краіне» [4].

Улічваючы досвед айчыннага літаратуразнаўства ў галіне вывучэння эстэтычных каштоўнасцей літаратуры Беларусі першай паловы XIX стагоддзя, можна сцвярджаць, што даследчыкі акцэнтавалі ўвагу на раскрыцці «грамадзянскага» патрыятызму ў творчасці Адама Міцкевіча, Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча, Яна Баршчэўскага.

Варта адзначыць, што служэнню Беларусі, якой сінанімічнае найменне «Літва», прысвяцілі свае творы і сваё жыццё многія паэты-рамантыкі: Ян Чачот, Ануфры Петрашкевіч, Тамаш Зан, Міхал Рукевіч, Аляксандр Ходзька, Ігнат Легатовіч, Габрыэля Пузыня. Іх патрыятычная свядомасць была абумоўлена сацыяльным станам: усе яны паходзілі са шляхты, якая жывілася культам свабодалюбства і спадзяванняў на аднаўленне былой шляхецкай дэмакратыі і незалежнасці. Адам Міцкевіч, Ануфры Петрашкевіч, Тамаш Зан, Міхал Рукевіч, Аляксандр Ходзька былі прадстаўнікамі маладой настаўніцкай інтэлігенцыі, якая займалася

Рэпазіторый БарДУ

інтэлектуальнай працай і існавала за кошт даходаў ад яе. Сучасны гісторык С. Я. Куль-Сяльверстава адзначае: «Педагогі былі, бадай што, больш за іншыя групы ангажаваны ў грамадскае і палітычнае жыццё. Роля асветы як рухавіка змен у грамадстве, нададзеная ёй у XVIII ст., не змянілася і на познім этапе Асветніцтва. Віленская навучальная акруга, за выключэннем народных вучылішчаў на ўсходзе Беларусі і езуіцкіх калегіўмаў, уяўляла з сябе фактычна “майстэрню”, дзе выхоўваліся будучыя дзеячы нацыянальна-вызваленчага руху» [5, с. 288]. Навуковец дэманструе факты патурання прафесуры Віленскага ўніверсітэта, Свіслацкай гімназіі, гімназіі ў Коржах у стварэнні тайных таварыстваў і даводзіць, што «патрыятызм выкладчыкаў праяўляўся па-рознаму, пачынаючы ад ідэалізацыі былой Рэчы Паспалітай на ўроках гісторыі, літаратуры і заканчваючы падбухторваннем да стварэння вучнёўскіх і студэнцкіх арганізацый ці прыкрывання іх ад цікаўнасці ўлад» [5, с. 289].

Ануфры Петрашкевіч, адзін з заснавальнікаў і самых актыўных дзеячаў Таварыства філаматаў, адшукаў матэрыял для сваіх твораў у вусна-паэтычнай творчасці беларускага народа. Патрыятызм маладога паэта раскрыўся ў захапленні нацыянальным фальклорам, па-мастацку інтэрпрэтаваным ім у ідыліі «Купала». Твор складаюць дэталёвыя апісанні абраду беларускага Купалля з пачатку раскладання агню з рытуальнымі песнямі-замовамі і фінальным ахвярапрынашэннем. Культ «духу продкаў» становіцца абярэгам ад нешчаслівай долі для маладых закаханых, якіх благаслаўляе сівенькі дзядок-жрэц: «І тут жа злучыў закаханым далоні / Ды ўвенчыў ім згодна са звычаем скроні. / — Жывіце, як продкі, — сказаў ім зычліва, — Каб толькі была ў вас дагледжана ніва. / Вам шчырая праца не дасць заняпасці» [6, с. 246]. Як відаць, патрыятычна настроеныя творцы пачынаюць па-мастацку ўзвышаць сялянскія прынцыпы жыцця. Гэтай жа пазіцыі прытрымліваўся і Ян Чачот, які пазней, ужо пасля вяртання з ссылкі складае «Сялянскія песні з-над Нёмна і Дзвіны з далучэннем іх арыгіналаў на славянска-крэвіцкай мове». І. Ф. Штэйнер, даследуючы творчасць Яна Чачота, сцвярджаў: «Гэтыя песні вызначаюцца сваёй наіўнасцю, прастатой і прыгажосцю, а таму, акрамя сваёй прывабнасці, могуць выказаць і нешта значна большае: характар, звычаі і норавы краю, дзе яны спяваюцца» [7, с. 87]. У вершы «Поле, поле шырокае» голас самаго паэта, праслаўляючы сонечнае ззянне, яснасць неба, зліваецца з народным хорам і просіць благаслаўлення працы на зямлі: «Благаславі твае дзеткі, / Працу нашу і палеткі, / Благаславі усе людзі, / Няхай усім добра будзе!» [8, с. 194]. У гэтых радках акумуляваны сэнс жыцця селяніна, які складаецца з працы на зямлі пад боскаю аховаю. А. С. Яскевіч у кнізе «Природа в свете Библии» даходліва тлумачыць, што менавіта селянін па родзе сваіх заняткаў знаходзіцца ў кругазвароце прыродных стыхій, ён у прамым сэнсе дзіця прыроды, якая ўспрымаецца ім як «Дом для Жыцця і Храм для духу» [9, с. 147]. Таму Ян Чачот імкнецца перадаць хрысціянскую сістэму поглядаў, што складалі ідэалогію беларускага земляроба.

Патрыятычнам пачуццём прасякнуты многія творы філаматаў на гістарычную тэму. Ануфры Петрашкевіч на адным з першых пасяджэннняў філаматаў прадстаўляе верш «Роздум каля руін Гедымінавага замку». Элегічны настрой лірычнага героя выкліканы цішынёй цёмнай ночы, якая выступае алегорыяй заняпаду былой велічы Вялікага княства Літоўскага: «Цяпер пад месяцам бязмоўным / Тут здань хіба ў кустоўях ходзіць, / І крык савы, адчаю поўны, / Жах на цябе і сум наводзіць» [6, с. 238]. Сімвалам былой велічы сваёй краіны, якую старажытныя замежныя падарожнікі і летапісцы называлі Сарматыяй, становяцца замкавыя руіны. Калісьці тут стаяў «думны замак», абараняючы ліцвінаў ад хіжых чужынцаў: «Пры замку тым літвін са зброяй / Стаяў, выглядваў з-пад забрала. / Ішлі чужынцы, безліч легла / Галоў іх перад гэтай цэглай» [6, с. 239]. Ануфры Петрашкевіч гераізуе простых, безыменных абаронцаў Гедымінавых уладанняў, якія «сякерай, доўбняй і паленнем» зніштажалі крыжакоў, а пасля ішлі араць поле, «сваю шукаць у працы долю». Паэт сцвярджае думку, што кожны народ пакутуе ад спрэчак уладароў, занятых барацьбой за ўласныя інтарэсы. Таму гіне веліч мужнага роду славянаў, які «здабычай стаў суседзяў хцівых» [6, с. 239]. Але для лірычнага героя любоў да Айчыны будзе жыць у душы, хоць і час сатрэ ўбачаныя замкавыя



Репозиторий БарГУ

руіны, як і гмахі Ягелонаў. Гэта пацвярджае думку аб этна-генетычнай аснове патрыятызму, калі новае пакаленне адчувае гістарычную повязь з продкамі, якія самаахвярна баранілі свой народ ад знішчэння.

Паплечнікам Ануфрыя Петрашкевіча па філамацкай дзейнасці з’яўляецца Тамаш Зан — арганізатар згуртаванняў беларускай шляхецкай моладзі Таварыства прамяністых, якое потым пераўтварылася ў Таварыства філарэтаў. Патрыятычны змест утрымоўвае яго нясконачаная паэма «Табакерка». Трэба патлумачыць, што сама табакерка — гэта каштоўная рэч, якую маглі мець заможныя людзі. Яна прызначалася не толькі для захавання нюхальнай табакі, але і для таемнай перапіскі, таксама існавалі музычныя табакеркі. Вобраз табакеркі сустракаецца ў казачным фальклоры («Аб Оху і залатой табакерцы), у мастацкай літаратуры («Сярэбраная табакерка» Змітрака Бядулі, «Гарадок у табакерцы» У. Ф.  Адоеўскага, «Табакерка майстра цацак» Андрэ Нартона, «Табакерка імператара» Джона Карра, «Табакерка з Багомба» Курта Ваннягута), у назвах музычных твораў (дзве розныя п’есы «Музычная табакерка» А. К. Лядавай і Т. П. Мікалаевай). Улічваючы дадзеныя мастацкія факты, мы можам з пэўнасцю сцвярджаць, што табакерка становіцца сімвалам пэўнага мініяцюрнага ўладкавання, сістэмы грамадскіх узаемаадносін. Яны могуць расшыфроўвацца як ідэальныя, гарманічныя і, наадварот, пачварныя, антычалавечыя.

Галоўны герой паэмы Тамаша Зана «Табакерка» — састарэлы «барскі вой-канфедэрат», прадстаўляе патрыятычнае пакаленне шляхты, якая ўваходзіла ў Барскі саюз, прадстаўнікі якога выступалі супраць уплыву расійскага царызму на палітыку каралеўскага ўрада Рэчы Паспалітай. Даследуючы творчасць Адамам Міцкевіча як прадстаўніка нацыянальнай рамантычнай традыцыі, Ірына Эрнстаўна Багдановіч адзначае: «Патрыятызм, што быў уласцівы сармацкаму светаадчуванню эпохі росквіту Барока ў Рэчы Паспалітай, апошнімі апалагетамі якога былі барскія канфедэраты,  легіянеры Касцюшкі, менавіта на хвалі рамантызму ўзнавіўся як прынцып светаадчування, як важная маральна-этычная катэгорыя, адсунутая ў ідэалогіі Асветніцтва на другарадныя пазіцыі» [2, с. 19]. Рамантык Тамаш Зан праз занятак вояканфедэрата, якія «Што ранку, уздзеўшы на нос акуляры, / Ён на табакерцы сваёй / Выколваў іголкай стальной / Дзівосы з дзівосаў» [6, с. 205]. Табакерку ўпрыгожвалі кампазіцыі з паганскай мінуўшчыны — спальванне-пахаванне легендарнага князя Свінтарога, з народнай міфалогіі — літоўскіх німфаў-русалак, з сённяшняга жыцця сялянства — шчыслівыя моманты вяселля і штодзённую працу гаспадара і гаспадыні. Захаванню такой ідэалістычнай карцінкі служыць майстар-штукар, а ў мінулым актыўны абаронца ідэалаў свабоды і незалежнасці, якіх пазбаўлены зараз у «забранай айчыне». Паэму «Табакерка», якая першапачаткова называлася «Смерць табакеркі», Тамаш Зан стаў пісаць у 1818 годзе, але не скончыў яе. Сімвалічна тое, што зменена назва твора. Нам падаецца, што гэта зроблена асэнсавана: пафас другой назвы абсалютна супрацьлеглы першай — ён аптымістычны, сцвярджальны. Табакерка ў паэме становіцца сімвалам не толькі памяці аб каштоўнасцях забранага краю, але і перадачы іх новым пакаленням дзеля захавання, абароны.

Актыўным дзеячам філарэцкага руху, распачатага Тамашам Занам, стаў Міхал Рукевіч. Маладым салдатам, ахопленым патрыятычным духам, ён абараняў ідэалы незалежнасці Рэчы Паспалітай у шэрагах арміі Напалеона, з імем якога беларуская шляхта звязвала вызваленне сваёй зямлі ад Расійскай імперыі. Як літаратар Міхал Рукевіч вядомы сваімі філамацкімі вершамі і публіцыстычнымі выступленнямі той жа пары. Верш «Хай звіняць аб чашу чаша» раскрывае яднанне сяброў пад адзінай ідэяй — патрыятычнае служэнне. Як сцвярджае Ірына Эрнстаўна Багдановіч, культ юнацтва становіцца топасам у паэзіі айчынных рамантыкаў. Маладыя людзі прагнулі перамен, яны былі энтузіястамі, верылі, што змогуць замацаваць даўнія сармацка-рыцарскія патрыятычныя ідэалы: «Не хадзіў наш продак хмуры, / Шчырасць скрозь была ў цане. / Жыгімонты ды Батуры / Клёк знаходзілі ў віне» [1, с. 185]. Залатая чара і напой у ёй становяцца сімвалам повязі маладога пакалення барацьбітоў з мінулымі героямі.

Рэпазітарый БарДУ

Вобраз чары, або чашы, прысутнічае ў «Песні філарэтаў» Адама Міцкевіча, «Песні філарэтаў» Антоні Эдварда Адынца. Сімвал залатой чары не выпадкова часта сустракаецца ў паэзіі філаматаў і філарэтаў. Ён быў запазычаны з сусветнай міфалогіі, якой захапляліся студэнты Віленскага ўніверсітэта, яны выступалі з навуковымі дакладамі на пасяджэннях таварыстваў. У міфах старажытных кельтаў ёсць паданні пра Святы Грааль — каменны сасуд у выглядзе чашы, зроблены са смарагду, які архангел Міхаіл выбіў з кароны Люцыфера. Гэта рэліквія ўцалела пасля Патопу, з яе прычашчаўся Ісус Хрыстос у час Тайнай вячэры, а пасля ў яе была сабрана кроў з ран Збаўцы. Паспрабаваўшы напой з яе, чалавек становіцца шчырым перакананым вернікам. Залатая чаша служыць асаблівым прычасцем — «хмелем радзімы», што яднае ўсіх у братэрстве, патрыятычных здзяйсненнях.

Блізкім сябрам Адама Міцкевіча быў Аляксандр Ходзька, які, калі стаў студэнтам Віленскага ўніверсітэта, запісаўся ў Таварыства філарэтаў. У 1829 годзе выдаў зборнік песен і балад «Песні», куды ўвайшоў твор «Старац». Лірычны герой звяртаецца да вайдэлота з просьбаю праспяваць літоўскую песню пра даўніх багоў, слаўных князёў, пра чароўныя абшары і гасціннасць жыхароў, бо «песні памяць нам вяртаюць, / Даўніну ўсю ўваскрашаюць» [6, с. 343]. Сам сталага веку слухач жадае слухаць песню на айчыннай мове. Вайдэлоты ў балтыйскай міфалогіі лічыліся жрацамі Крыва-крывейціса, якія ведалі магічныя словы і служылі перадачы сакральных ведаў. Пазней вайдэлоты сталі трактавацца як спевакі-захавальнікі народнага эпасу і гістарычнай спадчыны. Для рамантыка Аляксандра Ходзькі важным было абудзіць настальгію па страчаным далёкім часе. У дадзеным выпадку гэта пачуццё выконвае пазітыўную ролю, бо дазваляе ідэнтыфікаваць сябе як частку нацыянальнай супольнасці, ажыццявіць сувязь з «родным карэннем», фарміруе маральныя ідэалы і захоўвае каштоўнасці мінулага.

**Заключэнне.** Літаратура Беларусі першай паловы XIX стагоддзя развівалася ў рэчышчы рамантызму. Асноўнай эстэтычнай каштоўнасцю, якая дэманстравалася праз вобразнасемантычны рад паэтычных твораў, стаў «грамадзянскі» патрыятызм. Ідэйным стрыжнем паэзіі філаматаў і філарэтаў было вяртанне памяці аб магутнасці Айчыны, абуджэнне да дзеяння маладога пакалення ў справе вызвалення ад чужаземнага панавання. Патрыятычны светапогляд Ануфры Петрашкевіча, Тамаша Зана, Міхала Рукевіча, Аляксандра Ходзькі пamastацку быў увасоблены ў вобразах жраца, вайдэлота, таленавітага майстра барскага воякафедэрата, якія з’яўляліся носьбітамі «духу продкаў», у апісанні разбуранага замку, вобразах-рэчах чашы, табакеркі, якія сталі абазначаць повязь сучаснага маладога пакалення з міфалогіяй і гісторыяй Айчыны.

Рэпазіторый БарГУ

**Спіс цытаваных крыніц**


1. Літаратура Беларусі: першая палова XIX стагоддзя : хрэстаматыя / аўт.-уклад. К. А. Цвірка. — Мінск : Беларус. навука, 2000. — 572 с.
2. *Багдановіч, І. Э.* Авангард і традыцыі / І. Э. Багдановіч. — Мінск : Беларус. навука, 2001. — 387 с.
3. Философский словарь / под ред. И. Т. Фролова. — М. : Республика, 2021. — 720 с.
4. *Снеговая, М.* Слепые пятна любви к Родине [Электронный ресурс] / М. Снеговая. — Режим доступа : https://www.vedomosti.ru/opinion/articles/2016/07/11/648684-slepie-pyatna . — Дата доступа: 24.12.2020.
5. Гісторыя філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі : у 6 т. — Мінск : Беларус. навука, 2017. — Т. 4 : Асветніцтва / аўт. тома: І. М. Бабкоў [і інш.]. — 431 с.
6. Філаматы і філарэты : зборнік / уклад. К. Цвірка. — Мінск : Беларус. кнігазбор, 1998. — 400 с.
7. *Штэйнер, І. Ф.* Польскамоўная літаратура Беларусі / І. Ф. Штейнер. — Гомель : ГДУ, 2004. — 183 с.
8. *Чачот, Я.* Выбраныя творы / уклад. К. Цвірка. — Мінск : Беларус. кнігазбор, 1996. — 374 с.
9. *Яскевич, А. С.* Природа в свете Библии / А. С. Яскевич. — Минск : Царкоўн. слова, 2003. — 167 с.


Паступіў у рэдакцыю 11.01.2021.